— Мировые демократии предусматривают наличие в государстве так называемого теневого кабинета, т.е. правительства, сформированного политическими силами, находящимися в меньшинстве в структурах политической власти. Не имея формально голоса при принятии решений, данная структура служит своего рода противовесом официальной политике партии власти. Теневой кабинет — это возможность для официального правительства увидеть альтернативную точку зрения, сравнить подходы к решению различных проблем, внести коррективы как в аргументацию своей позиции, так и в саму позицию. Теневое правительство имеет важное место в общегосударственной системе сдержек и противовесов, способствует выработке наиболее оптимальных решений политических и социально-экономических проблем.

Для государства теневой кабинет — это оппозиционная структура, объединяющая, как правило, экспертов и являющаяся как бы первой оценочной структурой деятельности власти. Немаловажно, что налогоплательщики не платят за его содержание и получают как бы бесплатную возможность критического анализа решений тех, на содержание которых они регулярно платят налоги.

Теневой кабинет — это попытка ввести элемент конкуренции в процесс формирования и принятия решений на государственном уровне. Работа в теневом кабинете создает прекрасные возможности для формирования и кристаллизации общественных лидеров. Это испытательный полигон идей, аргументов и методологий достижения поставленных целей, место, где просто эксперты-профессионалы могут стать лидерами.

В идеале теневой кабинет должен опираться на независимые научные исследовательские и аналитические центры. Их независимость обеспечивают негосударственное финансирование и конкуренция за получение грантов от различных структур, в том числе от государства, на разработку различных проектов и программ. Государственная поддержка таких центров должна проходить согласно определенным правилам в процессе участия в открытых конкурсах и тендерах.

Престиж и авторитет лидеров таких организаций, их умение создать рабочую команду единомышленников оказывает существенное влияние на общественных лидеров и на те структуры, которые обращаются к экспертам за помощью. Посредством организации семинаров, научных конференций, "круглых столов" и иных мероприятий происходит передача знаний от экспертов к общественным лидерам и политикам при власти.

Ніл ГІЛЕВІЧ

Да чаго і дзеля чаго вяртацца?

Слухаю па радыё і чытаю ў газетах, як жыве наша суседка Літва. Цяжка жыве, вядома. Праблем — і эканамічных, і сацыяльных, і іншых — безліч. Але настрой у людзей добры, паныласці няма, бо ёсць упэўненасць, што гэтыя цяжкасці часовыя, бо "мы самі гаспадары ў сваім доме, самі выбралі сабе і адстаялі шлях незалежнага развіцця сваёй уласнай дзяржавы; а асабліва добра на душы ад таго, што па ўсёй краіне ўсе да адной установы працуюць на літоўскай мове і ўсе шыльды і шыльдачкі ў гарадах і вёсках — на літоўскай мове... Гэта галоўнае. Усё астатняе мы патроху-памалу адрэгулюем і наладзім. Галоўнае — быць самім сабою, мець сваё ўласнае аблічча, свой гонар і годнасць. Гэта надае нам сілы, мацуе веру і стварае настрой".

Амаль кожны дзень слухаю радыё другой нашай суседкі — Украіны. У мінулым годзе там адбыліся надзвычай важныя для лёсу народа і дзяржавы падзеі: уведзена свая ўласная грашовая адзінка (грыўна), а ўкраінская мова замацавана ў Канстытуцыі як адзіная дзяржаўная. І хоць бальшыні насельніцтва жывецца вельмі нялёгка, сацыяльныя праблемы абвастрыліся да крайнасці, аднак усведамленне таго, што краіна робіць крок за крокам наперад па шляху ўмацавання сваёй дзяржаўнай незалежнасці, зноў жа такі падымае ў людзей настрой і ўсяляе веру ў заўтрашні дзень. "Галоўнае, — гучыць у эфір з Кіева, — гэта незвычайны ўздым пачуцця нацыянальнай годнасці, наша вера ў новую, свабодную, незалежную Украіну. А цяжкасці — пераадолеем! На гэта ў нас розуму, сіл і натхнення хопіць!.."

А што ж тым часам адбываецца ў нас, у Беларусі? Што гучыць, і грыміць, і свеціцца ў яе сродках масавай інфармацыі? А ўсё тое, што наадварот, што ідзе насуперак развіццю і ўмацаванню дзяржаўнай незалежнасці краіны, адраджэнню яе ўласных пачаткаў і традыцый. Дзяржаўны статус беларускай мовы ва ўдарным тэмпе ліквідуецца. Запіс у Канстытуцыі — пустая фармальнасць: практычна ён амаль нічога не значыць. Пра ўласную грашовую адзінку ніхто і не заікаецца. Яшчэ чаго не хапала — беларускі талер увесці! Не пра гэта думаеце, нацыяналісты! Паслухайце, што "гаварыць" народ, чаго народ патрабуе! І сапраўды ёсць што паслухаць: ажно з 30-х гадоў такога не чулі!

Калі беларускім народам лічыць прафесіянальных платных "палітагітатараў" і некаторых запраданцаў-журналістаў, то "народ" патрабуе, па-першае, расправы над беларускімі нацыяналістамі, а па-другое, аднаўлення СССР і вяртання ў сацыялістычны рай, у якім "мы жылі як людзі". Гэтага ж патрабуе і дзяржаўная сімволіка Беларусі — найбольш абагуленае ўвасабленне палітычных і сацыяльных ідэалаў грамадства. Пра што яна гаворыць, куды яна кліча? Гаворыць, што канцэптуальна ў нас нічога не змянілася ў поглядах на сацыяльна-эканамічную і палітычную стратэгію краіны, а кліча — назад — туды, дзе мы яшчэ не так даўно былі, — у феадальна-прыгонны і дзяржаўна-рэпрэсіўны "сацыялізм".

Многія нашы грамадзяне, у тым ліку палітыкі, публіцысты, навукоўцы, надта ж шкадуюць, што разваліўся СССР, і галоўную прычыну развалу, прычыну адчужэння нацый, народаў і людзей бачаць у "сатанінскай дзейнасці" заходніх і празаходніх ідэолагаў. Гэта ўсё яны, яны! Гэта яны задумалі і ўсякімі спосабамі і сродкамі ажыццяўлялі сваю мэту!" Так, вядома, "сатаністы" працавалі і вельмі шчыравалі, каб здарылася тое, што нарэшце здарылася, — каб СССР распаўся. Але праца іх заключалася ў выкарыстанні аб'ектыўных умоў распаду імперыі, — умоў, якія наспявалі і наспелі ў выніку правядзення Крамлём адпаведнай нацыянальнай палітыкі.

Хацеў бы сказаць — палітыкі трагічна памылковай, але не магу, бо яна была зусім свядомая і мэтанакіраваная, з непахіснымі "навукова-тэарэтычнымі" апорамі. Цяпер гэту палітыку называюць імперскай, вялікадзяржаўна-шавіністычнай. Такой яна, па сутнасці, і была. І ў гэтым — першапрычына і прычына прычын распаду магутнага "непарушнага" Саюза. Мудрая руская прыказка кажа: "От добра добра не ищут". Калі б рэспублікам было добра ў Саюзе, калі б у дачыненні да іх праводзілася мудрая, гэта значыць справядлівая, спрыяльная, добразычлівая, нацыянальная палітыка, калі б кожная рэспубліка валодала неабходным суверэнітэтам, правам самастойна вырашаць пытанні эканамічнай, сацыяльнай і духоўнай жыццядзейнасці ў інтарэсах свайго народа, ці выспела б у душах нацыянал-патрыётаў крыўда, з якое пайшлі трэшчыны адчужэння і разлому? Але мудрасці якраз і не было. Было вялікае хітраванне. Або — вялікая дурнота. Усё зліём у адзін кацёл, грунтоўна перамяшаем і ўтворанае варыва назавём "новай гістарычнай супольнасцю — савецкім народам". І ніякіх нацыянальных праблем! Проста і лёгка вырашым іх назаўсёды!

Перахітрылі саміх сябе стратэгі гэтага варыўна-катлавога курсу нацыянальнай палітыкі. Наколькі ён быў нямудры, неразумны, ненавуковы, валюнтарысцкі, засведчыў не толькі імгненны распад Саюза ССР, але і распад усяго сацыялістычнага лагеру — з самаліквідацыяй СЭУ і Варшаўскага пакта. Пацвердзілі гэта і ганебная ваенная катастрофа ў Афганістане і не менш ганебная крывавая бойня ў Чэчні... Неверагодная няздольнасць зразумець, што кожны народ хоча сам распараджацца сваім лёсам! Кожны! А тым больш народ з вялікім, шматвяковым гістарычным шляхам, са сваёй дзяржаўнасцю ў мінулым (як, напрыклад, наш, беларускі).

Дык што, шаноўныя грамадзяне, будзем вяртацца ў той "сацыялістычны" Саюз? Туды, дзе народ старажытнай культуры зноў будзе зіпаць як рыба на пяску, і моўчкі сыходзіць з гістарычнай арэны? Туды, дзе зноў не будзе ніводнай беларускай школы ў гарадах і мястэчках Беларусі? Туды, дзе наша нацыянальная культура зноў будзе толькі фігавым лістком для прыкрыцця сораму? Туды, дзе нам зноў будуць указваць, які і дзе прышыць гузік, не кажучы ўжо аб тым, які і дзе пабудаваць завод?..

Дарэчы, хочацца спытаць у тых, хто нязмоўчна крычыць аб неабходнасці аднавіць СССР: скажыце, а на каго разлічаны гэты крык? Каму ён адрасаваны? Украіне? Арменіі? Грузіі? Узбекістану? Малдове? Краінам Прыбалтыкі? Вы што, панове, ужо ведаеце волю гэтых народаў? Ведаеце, што яны хочуць жыць, як і раней, у адным дзяржаўным табары? Не ведаеце? Дык, можа, спачатку спытаеце іх. Напрыклад, прэзідэнт Украіны Л.Кучма перад самым Новым годам заявіў: "Украина проводит политику, исходя из своих национальных интересов. Мы предлагаем России партнерство, нормальное сотрудничество — равноправное и добрососедское. Многие не согласны с этим, но на роль Беларуси, как вы понимаете, Украина никогда не пойдет" ("Литературная газета" за 25.XII.1996 г.). Калі не ўлічыць думку і пазіцыю іншых краін СНД, то можа атрымацца, што ўвесь новы Саюз будуць складаць толькі Расія і Беларусь. Ці не так?

Зрэшты, многія і не хаваюць таго, што яны патрабуюць іменна гэтага — каб Беларусь была інкарпаравана ў склад Расіі. Як дзвесце гадоў назад. І каб ад ненавіснай ім беларушчыны "здесь, на западе России" і духу не засталося. Вось на беларускім тэлеэкране досыць высокі маскоўскі госць — такі ласкавы, такі дабрадушны, такі ўсмешлівы: "Братья-белорусы, да надо нам быть вместе, надо нам жить одной семьей, у нас же одни корни, одна история, одна культура..." А што ж вы, шаноўны дабрадзею, не дагаварылі шаблонную фразачку да канца? Што ж не сказалі "и один язык"? Што вы спыніліся на паўслове?

Вось іменна: адна, адна, адна! Адна гісторыя — расійская (і таму нацыянальныя героі ў Беларусі — знакамітыя расіяне: 20 (30? 40?) калгасаў імя Суворава і, здаецца, толькі адзін — імя Каліноўскага; 100 (200? 300?) вуліц імя Калініна ці Горкага і ніводнай — імя Ігнатоўскага, Ластоўскага, Смоліча...).

Адна культура — расійская (і таму на кожныя 100 песень у беларускім эфіры — 95 расійскіх, а на кожныя 1000 паасобнікаў выдадзеных кніг — 990 на рускай мове).

Адна мова — руская (і таму ўсе да адной установы і прадпрыемствы ў Беларусі працуюць на рускай мове — тут ужо і аднаго працэнта беларускага не набярэцца).

Гэта — рэальнасць, а не прыгожыя словы пра дружбу і братэрства.

І так, сваёй уласнай гісторыі ў Беларусі і беларускага народа няма. І сваёй культуры таксама. Якая там культура? Сёе-тое фальклорнае, нейкая жменька пісьменнікаў ды мастакоў жменька... І сваёй мовы няма. Дзе яна? Трошкі — у тых жа пісьменнікаў? У некаторых вясковых школках? У пяці-шасці тэатрах? Дзе яшчэ? Вартая жалю "трасянка" на радыё і тэлебачанні?..

Калі пра гэтае адна-адна-адна гаворыць ці піша маскоўскі дзядзька — тут усё зразумела. Цяжэй зразумець таварыша сваёй гадоўлі. У навагоднім нумары газеты "Белорусская нива" чытаем: "Жили мы, люди великой страны, что там ни говори, одной общей судьбой". І далей: "И, конечно же, стояли за этим "то-то" новые школы, библиотеки, Дома культуры, спортивные комплексы..." І так, "одной общей судьбой". І які ж лёс чакаў нас, беларусаў, — як нацыю, як этнас? Гэткі ж, як і рускіх? Гэткая ж гістарычная перспектыва росквіту нацыянальнай культуры, літаратуры, тэатра? Беларускай базавай, сярэдняй і вышэйшай школ?

І мы маглі ў гэтую перспектыву, у гэты "шчаслівы агульны лёс" паверыць, бачачы, што ўжо ад Беларусі беларускай амаль нічога не застаецца?! Што Беларусь беларуская ўжо задыхаецца і канае?! Вы пішаце, шаноўны, пра новыя школы? Так, яны будаваліся. Але колькі з іх, з тых, што ўступалі ў строй у гарадах і мястэчках, было беларускіх? Не ведаеце? Дык я вам скажу: ніводнай.

Пане, калі Вы яшчэ не развучыліся чытаць па-беларуску — прачытайце гэты радок яшчэ раз і па складах: ні-вод-най бе-ла-рус-кай!.. І гэта быў наш лёс?! А ў "новые библиотеки" вы заходзілі? Якое ж месца там на паліцах займае беларуская кніга? На сто тамоў небеларускіх — адна? А часопісы і газеты, выпісаныя за бюджэтныя сродкі рэспублікі? На 40—50 рускамоўных падпісак 4—5 беларускіх? І гэта "наша общая судьба"? А з дзейнасцю "новых Домов культуры" вы знаёміліся? Бачылі іх візуальнае афармленне, глядзелі іх культасветныя і мастацкія праграмы? Многае ў іх сказала вам пра росквіт беларускай культуры, пра беларускі патрыятызм іх супрацоўнікаў? Вам не здавалася, што вы знаходзіцеся ў Доме культуры ў Пензенскай ці Кастрамской губерні?.. Ці вы настолькі былі захоплены ідэяй "общей судьбы", што на такія дробязі проста не звярталі ўвагі? "Ну и что, если все на русском? А какая разница? Ну, будет одним языком и одной национальной культурой меньше! Ну и что? Ну, станет на одну нацию, на один славянский народ меньше! Ну и что? Подумаешь, трагедия! Вон сколько в Сибири разных нивхов и удэге не стало — ну и что?.."

Цяжка, ды і няма сэнсу гаварыць з тымі, хто заўсёды і на самы балючы довад вам цынічна-спакойна адкажа: "Ну и что? Но зато наши трактора известны во многих странах мира!.."

Цяжка гаварыць на розных мовах. З начальнікамі. З асветнікамі. З навукоўцамі. З банкірамі. Са слугамі Бога на зямлі — святарамі. І пакуль будзем гаварыць на розных мовах — будзем жыць не сваёй і не "общей", а чужой "судьбою", чужым жыццём і лёсам. Чужым, панове, чужым! І вы гэта выдатна ведаеце. І гэтага хочаце, гэтага дамагаецеся.

Дык, можа, хопіць хлусіць наіўным і даверлівым людзям? Але без хлусні тварыць чорную справу ліквідацыі беларускай мовы, беларускай нацыянальнай культуры, гістарычнай памяці беларускага народа немагчыма. Без хлусні і без цынізму. Цынізм "ліквідатараў" настолькі беспардонны, што чалавека сумленнага проста абяззбройвае. Задумаемся на хвіліну: сёння з усіх трыбун (і вусна і пісьмова) нас, усходніх славян, заклікаюць: "Яднаймася, браты і сестры! Яднаймася! Толькі разам, толькі ў супольнасці, у дзяржаўным адзінстве і толькі з праваслаўным крыжам на сэрцы мы ацалеем і выстаім перад націскам ворагаў славянства!.."

Чакайце, чакайце, чакайце, панове! Я — таксама славянін і стаю за тое, каб кожны славянскі народ са сваёй самабытнай духоўнай культурай ацалеў і жыў-векаваў у свеце. На гэта, не палічыце нясціпласцю, я і жыццё паклаў. Але хто ацалее і хто выстаіць? Дзе ісціна: у вашых словах ці ў вашых дзеяннях? І дзе логіка?

Вы ж усё робіце для таго, каб адзін са славянскіх народаў, а менавіта беларускі, згінуў, знік, растварыўся ў стыхіі другога! Каб зніклі яго мова, літаратура, культура! Яго нацыянальная школа! Дык пра якую супольнасць, пра якое яднанне вяшчаеце? Пра тое, у выніку якога не стане аднаго з усходнеславянскіх народаў? А яго ж не стане, калі ў краіне будзе праводзіцца той курс на "супольнасць", на палітычнае аб'яднанне, які сёняшнія ўлады пачалі ажыццяўляць!

Пяць гадоў назад была перамагла ідэя нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі. І было ўжо нямала зроблена на гэтым адзіна правільным, адзіна плённым шляху. Многія паспелі зразумець: толькі гэта ідэя можа аб'яднаць увесь народ Беларусі, абудзіць у ім і паклікаць да жыцця тую творчую энергію, якая ўрэшце прывядзе краіну да эканамічна-сацыяльнага і духоўнага росквіту. Многія — але далёка не ўсе.

А тым часам "пятая калона" не спала. І трох гадоў не прайшло, як "ворагі беларушчыны" (Я.Купала) апомніліся, змабілізаваліся і пачалі руйнаваць яшчэ слабыя збудаванні нацыянальнага адраджэння і нацыянальнай незалежнасці. Па прычыне раз'яднання дэмакратычных сіл, не ўзброеных адзінай беларускай ідэяй, удалося правесці два антыбеларускія рэферэндумы, навыбіраць у Вярхоўны Савет рэнегатаў, запраданцаў і проста бяздумных абывацеляў.

Пасля 24-га лістапада Беларусь канчаткова перастала быць прававой дэмакратычнай дзяржавай. Пераварот адбыўся. Пераварот палітычны, антынацыянальны, антыбеларускі! Бо што датычыць усяго астатняга — эканомікі, сацыяльнай сферы — нічога ў выніку жульніцкіх плебісцытаў не змянілася. Як каціліся, так і коціцца. Мэта ад самага пачатку — ад ліпеня 94-га — была акрэслена іншая: палітычная. Не дапусціць станаўлення і ўмацавання суверэннай беларускай дзяржавы! Таму што суверэнная, незалежная Беларусь пачне распараджацца сваім лёсам сама — і хто ведае, да чаго дараспараджаецца! Вопыту ж не мае, бедненькая!..

Новы, 1997 год далакопы беларушчыны сустрэлі ў радасным настроі, паціраючы ад задавальнення далоні. Думаю, аднак, што іх радасць хоць і вялікая, але не трывалая, мітуслівая неспакойная. І яны самі гэта адчуваюць. Так, панове, так! Радасць ваша будзе слабець і слабець, меншаць і меншаць. Гэтаму будзе садзейнічаць, па-першае, эканамічна-сацыяльная сітуацыя, якая нічога вясёлага не абяцае і абяцаць не можа — па той жа прычыне, што кіраўніцтвам краіны праводзіцца антыдэмакратычны, антыбеларускі курс. Па-другое, і гэта галоўнае: да беларускай нацыянальнай ідэі пачало паварочвацца ўсё больш і больш разумных, разважлівых, заклапочаных лёсам Беларусі грамадскіх сіл, і яна, гэта ідэя, будзе паступова ператварацца ў агульную палітычную платформу. Іншага проста нічога не застаецца.

Нейкай іншай гістарычнай перспектывы ў нас няма. Усё іншае — тупік, самазабойства, гібель. Як патрыёты Бацькаўшчыны, грамадзяне Беларусі будуць вымушаны інтэнсіўна беларусізавацца, і не толькі фармальна, а і па сутнасці — духоўна і душэўна, унутрана. Адзнакай грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў 1997 годзе будзе менавіта гэта.

ГЛОБУС

Казахстан

Нурсултан Назарбаев объявил своим указом 1997 год Годом общенационального согласия и памяти жертв политических репрессий

Как отметил в интервью Интерфаксу помощник главы государства Ермухамет Ертысбаев, президенту поступали многочисленные обращения граждан, общественных объединений и организаций с просьбой принять такое решение.

Россия

Интересы Бориса Ельцина будет защищать Сергей Шахрай

Президент России Борис Ельцин подписал Положение о своем полномочном представителе в Конституционном суде Российской Федерации.

Население России к началу декабря 1996 года составило 147,5 млн. человек

По данным Госкомстата, в 1996 году смертность в России продолжала превышать рождаемость. С января по октябрь умерло 1 млн. 763,2 тыс. человек, тогда как родилось 1 млн. 101,6 тысяч. Естественная убыль населения (разность между числом умерших и родившихся) составила 661,6 тыс.человек. По итогам десяти месяцев 1995 года она составляла 671,6 тыс. человек.

Для областей центральной России наряду с низкой рождаемостью характерна и самая высокая в стране смертность. В Псковской, Тульской, Тверской, Новгородской, Рязанской, Ярославской, Курской, Костромской, Смоленской и Тамбовской областях на каждую 1000 жителей в 1996 году умерло 17—20 человек.

Узбекистан

Отказ от участия в военно-политических блоках подтвержден законом

Эта позиция среднеазиатского государства зафиксирована в законе "Об основных принципах внешнеполитической деятельности Республики Узбекистан".

Закон принят на сессии парламента республики. Важнейшей задачей во внешнеполитической деятельности Узбекистана является активное участие в работе ООН, ОБСЕ и других международных организаций, интеграция в европейские, азиатские мировые структуры безопасности.

В Узбекистане вступил в силу Закон "О политических партиях"

В соответствии с документом политические партии "создаются и действуют для реализации прав и свобод граждан на основе свободного волеизъявления".

Закон запрещает создание партий, имеющих целью насильственное изменение конституционного строя, выступающих против суверенитета, целостности и безопасности Узбекистана, конституционных прав и свобод ее граждан, а также пропагандирующих войну, социальную, национальную, расовую и религиозную вражду, посягающих на здоровье и нравственность народа.

Гражданин Узбекистана может быть членом только одной политической партии. Государство гарантирует защиту прав и законных интересов партий, создавая им равные правовые возможности для выполнения уставных целей и задач.

Органам государственной власти и их должностным лицам запрещается вмешиваться во внутренние дела политических партий либо препятствовать их деятельности. Все мероприятия партии проводят в нерабочее время и за счет собственных средств.

В законе записано, что для создания политических партий необходимо собрать не менее 5 тыс. подписей граждан, проживающих минимум в восьми территориальных областях.

Денежные фонды партий формируются из членских взносов, доходов от издательской деятельности, средств граждан и общественных объединений.

Политическим партиям запрещено прямо или косвенно получать средства или имущество от государственных органов, предприятий, учреждений, организаций и граждан иностранных государств, а также от международных институтов и религиозных организаций. Партии не имеют права открывать счета в зарубежных банках.

Государство может субсидировать политические партии в связи с их участием в выборах.

В настоящее время в Узбекистане действуют четыре партии. Наиболее крупная из них — Народно-демократическая партия (НДПУ, создана на базе Компартии Узбекистана) насчитывает 410 тыс. человек.

"Ватан тараккиети" ("Прогресс партии") объединяет 40 тыс. членов, а социал-демократическая партия "Адолат" ("Справедливость") и демократическая партия национального возрождения "Миллий тикланиш" — по 7 тыс. человек.

По материалам "Интерфакса".

Герои и сюжеты зарубежной прессы

Самоубийство крестного отца

Один из главарей сицилийской мафии "Коза ностра" Джакомо Джузеппе Джамбино повесился на веревке, сделанной из простыни, в миланской тюрьме "Сан Витторе". 55-летний Джамбино находился в одиночке с 1994 г., когда был осужден за убийства, торговлю наркотиками, хранение взрывчатых материалов. Тюремный охранник обнаружил его уже агонизирующим. Попытки реанимации оказались тщетными. Джамбино чувствовал себя нездоровым, опасался, что у него рак. Как один из наиболее опасных мафиози, он был абсолютно изолирован от остальных заключенных.

Лидер польских националистов снова перед судом

Районный суд в Варшаве начал новое рассмотрение дела Болеслава Тейковского, руководителя "Польского национального объединения", партии с шовинистическим уклоном. В феврале 1992 г. Тейковский в листовках, распространявшихся в школах Жолибожа (район Варшавы), призывал к борьбе с "жидовской властью" и демонстрациям против "антипольской власти евреев". Во время предыдущего процесса по этому делу судьи пришли к выводу о недоказанности того, что листовки были предназначены для распространения, а также подтвердили право Тейковского оглашать "определенные взгляды", касающиеся личностей, не имеющих с ним непосредственных контактов. В результате дело было прекращено с формулировкой — "ввиду ничтожного общественного ущерба". Однако суд второй инстанции (воеводский) нашел ряд формальных нарушений и возвратил дело для нового рассмотрения.

Растет число жертв на автомобильных трассах Америки

За последние пять лет на 51 процент выросло количество погибших и получивших увечья на скоростных автомагистралях США. За это время произошло более 10000 катастроф, погибли 218 человек, были ранены 12610. Причина отнюдь не в плохом состоянии дорог — они великолепны. Эсперты отмечают резко возросшую агрессивность водителей. Если раньше недовольные поведением коллеги за рулем матерились или крутили пальцем у виска, то теперь они хватаются за пистолет. В лучшем случае в ход идут палки и монтировки. В качестве предметов метания во "вражеский" автомобиль употребляются бутылки и банки с пивом. Драки на дорогах между владельцами автомобилей стали обычным явлением. Как правило, более других любят доказывать силой свою правоту молодые мужчины, не имеющие образования, но с криминальной биографией. Впрочем, и люди с высшим образованием нередко выясняют отношения на дорогах с помощью "кулачного права".

Специалисты считают агрессию на дорогах отражением напряженности в других сферах общественного быта.

Бывший премьер-министр Индии — взяточник

В Дели начался первый из трех уголовных процессов против бывшего премьер-министра страны Нарасимхи Рао. Его обвиняют в получении в 1983 г., когда Рао был министром иностранных дел, взятки в 100000 долларов от лондонского бизнесмена Лахубая Патхака за невыполненное обещание содействовать правительственному контракту на доставку газетной бумаги и целлюлозы. Кроме того, ему инкриминируют подкуп четырех депутатов парламента, обеспечивших вотум доверия в 1993 г., а также фальсификацию документов с целью дискредитации бывшего премьера Сингха (якобы сын последнего имел банковский счет на караибском острове Святого Киттса). Рао утратил пост премьер-министра в мае 1996 г. после поражения на выборах партии "Индийский Национальный конгресс".

Чехия прикрывает двери

В Чехии подготовлен новый проект закона об иностранцах и праве политического убежища. Предполагается усилить контроль над прибывающими в страну иностранцами и теми иностранными гражданами, которые получили право постоянного или долговременного пребывания в Чешской Республике. Причина этих мер — рост числа иностранцев и связанная с ним проблема внутренней безопасности. Согласно последним данным, в Чехии живут 200000 подданных других государств, главным образом из Украины, Вьетнама, Китая, Румынии, Польши. В Праге обитают несколько тысяч американцев и немцев. Новые правила, касающиеся пребывания иностранцев в Чехии, предусматривают более жесткие критерии при получении права на работу. "Черный труд" будет рассматриваться как преступление. Более жесткой станет визовая политика. У граждан стран, с которыми Чехия имеет соглашения о безвизовом обмене, пограничный контроль будет требовать предъявления приглашения либо денежной суммы, достаточной для срока пребывания.

"Золотая рыбка" против компьютерной мафии

После трех лет следственной работы полиция четырех европейских стран провела молниеносную акцию против азиатской мафиозной банды, действовавшей на компьютерном рынке. В один день две тысячи полицейских провели обыски в 400 фирмах и частных помещениях в Германии, Франции, Бельгии и Италии. Операция осуществлялась под названием "Золотая рыбка". В ФРГ арестовали 11 человек, 3 задержали в других странах, идет розыск еще 13. Большинство подозреваемых — граждане Лаоса. Им будут предъявлены обвинения в нелегальном провозе в Европу дешевых комплектов компьютерной техники, изготовляемой в Азии, и подделке торговых знаков всемирно известных фирм, понесших убытки в сотни миллионов долларов.

Подготовил Александр ШОРТ.

Кто – кого?

"Киллеры" спокойно разъезжают по просторам бывшего Союза, а гоняться за ними у следователей нет денег

Пишу под впечатлением беседы со следователем по особо важным делам Прокуратуры Республики Александром Рассолько, который заканчивает так называемое "дело о киллерах". Многие подробности и детали этого 23-томного дела в нашем довольно коротком разговоре он опустил из-за многоэпизодичности событий, но в общих чертах картина ясна. Хотя впереди еще судебное разбирательство, которое, как ожидается, будет долгим и бурным, а в какой-то мере — непредсказуемым.

Года полтора назад о захвате преступной группы журналисты писали довольно много. Однако зачастую публикации строились на догадках и версиях. Даже число задержанных "плавало". Кто говорил о восьми киллерах, а кое-кто утверждал, что их было десять. Однако теперь ясно: в качестве обвиняемых на скамью подсудимых сядет 12 человек, в отношении двоих дело прекращено в связи с отсутствием состава преступления. Один из членов преступной группировки, несмотря на многочисленные угрозы, добровольно покинул ее ряды и скрылся.

Основная цель, которую преследовала группа, — "рациональная организация преступной деятельности". Именно так это звучит на профессиональном языке прокуроров. Однако вникнем в саму деятельность "организации", как ее окрестили сами члены группировки и взглянем на их, так сказать, лица.

Вот что говорит по этому поводу Александр Рассолько, который за свои двадцать лет работы в органах повидал всякого:

— Если бы мне самому по долгу службы не пришлось столкнуться с этими людьми, то, вероятно, все услышанное от кого-то по этому поводу я принял бы за некую придуманную детективную историю. Все, что касается деятельности этой группировки, было продумано до мелочей, создается впечатление, что подготовка велась на уровне подразделений спецназа, вплоть до вооружения и оснащения. Сам руководитель организации принимал экзамены по общей спортподготовке, восточным единоборствам и стрельбе. А для того, чтобы бойцы находились в хорошей форме, арендовались спортзалы, нанимались и хорошо оплачивались тренеры, ровным счетом, как и квартиры для проживания и питания киллеров.

Мало того, некоторые были вооружены самыми последними образцами стрелкового автоматического оружия, такими как, например, сорокапятизарядный короткоствольный автомат с глушителем марки "Ингрэм М-10". Не считая пистолетов "ТТ" и "Макарова". И еще в их арсенале в полном достатке имелись бронежилеты, рации, скоростные автомобили. Одним словом, что душа пожелает, но главное — стремление, я бы сказал одержимость вершить злодеяния.

Откуда это? Не будем вводить себя в заблуждение и пожимать плечами в наивном неведении. Если насчет оружия, то это сегодня не проблема. Его сколько угодно "плывет" из Чечни, Таджикистана, да мало ли еще из каких "горячих" точек.

Следователь Рассолько:

— Если бы у меня была дочь и сказала, что выходит за одного из них замуж, я бы без слов благословил их брак. И не мог подумать, что у этих в общем-то симпатичных парней безжалостное звериное нутро, выросшее на почве больной меркантильности, отчасти родившееся на резком социальном разделении общества. Один из них на допросе так и сказал: "В силу сложившихся обстоятельств я понял, что, соблюдая закон, никогда не смогу жить в достатке, как бы мне этого ни хотелось..." В принципе, они все придерживаются такого мнения. И крыть их карту вроде и нечем. Ведут себя агрессивно. На своем веку я знал многих, совершивших убийства. Видел, как они доходят в самобичевании и буквально сгорают до суда. В данном случае совсем противоположное. Только и слышишь от некоторых: "Да я бы его суку, еще раз..." Просто становится страшно от их ненависти и цинизма.

Любая ретушь реальности опасна и даже губительна, здесь она опасна вдвойне, если не втройне. Ведь речь идет о том, что зримо оказывает влияние на всю нашу теперешнюю и будущую жизнь. По сути говоря, за какое-то десятилетие в нашем обществе выросли стаи волков, которым не дай кусок — разорвут в клочья. Они прекрасно ориентируются в расстановке политических сил и идеологической конъюнктуре. Но, увы, действуют не по тем стереотипам, которые для них подготовили, а предпочитают свой, совершенно неожиданный путь. Пусть даже и преступный. А в данном случае вполне сходясь в убеждении: от жизни надо брать все, при этом любой ценой. Соединить интеллект, молодость с кулаками, оружием — и...

Наверняка прав следователь Рассолько, когда говорит, что "преступность постепенно начинает контролировать все сферы жизни". Не потому ли так трудно она раскрывается? И вся соль заключается не в том, что следователь не может раскрутить дело из-за своего низкого профессионального уровня. Дело в другом. Преступность не знает границ. Преступники, сделав дело, смываются в другую страну. Нет, не угнаться за ними сыщикам. А если и повезет, то на пути встают большие трудности из-за недоработок "Конвенции о правовой помощи и правовым отношениям по гражданским, семейным и уголовным делам".

Оставим пока "дело о двенадцати" и освежим в памяти убийство Александра Лисинчука и некоторые причины этого преступления. Многие журналисты считают это дело "глухим", а если и вспоминают о нем, то непременно вставляют шипы в бок следственным органам. Так вот, в самом начале расследование вела столичная прокуратура. Помнится, еще тогда следователь по особо важным делам Владимир Клопов сетовал на бюрократические проволочки. Следы преступления вели в Эстонию, Финляндию, ФРГ. Взять хотя бы винтовку типа "Крико Матч 600", выстрелом из которой был убит банкир. Изготовлена она фирмой "Кригенскорте-Фюрт" (Бавария), а оптический прицел — концерном "Шмидт и Бендер". Это довольно дорогостоящие системы оружия и изготавливаются они под заказ и только малыми партиями. Перво-наперво необходимо было выяснить, каким образом винтовка через Эстонию была ввезена в Беларусь. Тогда визит следователя в Прибалтику затянулся по независимым от него причинам, а след тем временем остывал. И все из-за нехватки денег на командировку.

Версий у следствия было много, и все они тщательно прорабатывались, пока не остановились на "нефтяной", которую и стали тщательно разрабатывать. Незадолго до убийства Лисинчука в московский банк "Столичный" на счет авиатранспортной компании "Витязь" поступило 4 миллиарда рублей кредита на закупку нефтепродуктов. По тем временам это были немалые деньги. Плюс к этой сумме еще 750 миллионов рублей на свой счет в этот банк положил концерн "Коминвест". Белорусским криминалистам удалось выяснить, что в течение восьми месяцев эти деньги где-то "крутились", но никто не знал о их точном местонахождении. Некоторые подробности белорусские сыщики попытались узнать от председателя банка "Столичный" господина Смоленцева. Но в аудиенции было отказано, а подробная запись о финансовой операции с дискеты оказалась стертой. По крайней мере, так сказали сотрудники банка. Одним словом, приходится только гадать на кофейной гуще — может быть, а может, и нет.

Но, как выяснилось, гибель Лисинчука оказалась последней смертью в цепи, которая связана с авиатранспортной компанией "Витязь". Несколько раньше при загадочных обстоятельствах, в автокатастрофе погиб один из учредителей компании С.Петрушин. Затем пропадает без вести неофициальный коммерческий директор М.Кадиев. Его брат, приехавший разбираться в обстоятельствах этой смерти, был застрелен. А несколько позже было совершено покушение на жизнь администратора АТК "Витязь" А.Трухина.

Таким образом, дело приняло довольно-таки запутанный характер и через некоторое время из городской прокуратуры перекочевало в республиканскую и находится сейчас в следственном процессе у Александра Рассолько, который уверяет, что оно не потеряло интереса и вовсе не относится к типу "глухих", просто над ним надо работать и работать.

Как уже говорилось, на командировки следователей денег нет. Более того, по условиям вышеназванной конвенции белорусский следователь на территории другой страны не имеет права вести следственные действия, то есть проводить допросы. Плюс ко всему ехать в командировку с табельным оружием работникам прокуратуры запрещается.

В еще более каверзное положение попала следственная группа КГБ, ведущая расследование по делу об убийстве председателя Гродненского облисполкома Дмитрия Арцимени. Их вообще на пушечный выстрел не подпускают к территории Литвы, где есть ряд невыясненных вопросов по поводу деятельности областного главы. Поэтому наши сыщики вынуждены идти на разного рода ухищрения в смысле добычи информации. Но проку от этого мало.

Пока по "делу о киллерах" остается добавить, что руководителя "организации" некоего С. из Солигорска и его брата, командира одного из звеньев, правоохранительным органам так и не удалось задержать. А отыскать его в России не представляется возможным из-за отсутствия средств предположительно на двухмесячную командировку. Зато он не молчит, а угрожает в открытую: "дескать, только попробуйте посадить моих орлов, соберу человек 60 и вам такое устрою...". И реалист Александр Рассолько в его словах не сомневается.

Александр ЛАППО.

Міхась ГРЫБАЎ

Германія: праз 50 гадоў

Запіскі былога остарбайтэра

(Працяг. Пачатак у мінулым нумары.)

Частавалі маслам, сырам, смятанкай да кавы — усё з магазіна. Цікаўлюся: чаму нічога няма свайго? "А навошта? — гаворыць старэйшы. — Па-першае, гэтак смачна не прыгатуем, як робяць на заводзе, па-другое, нам танней у магазіне купіць, чым сваё малако есці, бо дзяржава за нашу прадукцыю выдзяляе датацыю".

Я звярнуў увагу, што ў такім вялізным домегмаху вельмі цёпла. Пацікавіўся: чым абаграваюць? Малады гаспадар павёў у падвальнае памяшканне. Там стаіць кацёл, які працуе на драўлянай сечцы, апілках, бо газ у гэты глухі закутак яшчэ не падведзены. Паліва шнэкам падаецца з бункера, які выкапаны ля сцяны дома, у печ. Камп'ютэр рэгулюе ўнутранае згаранне паліва на адпаведна зададзеную тэмпературу. Расход драўлянай масы невялікі.

Ехалі дахаты, а я ўсё думаў пра незвычайны кацёл, які дае таннае цяпло. Ці не рашэнне гэта энергетычнай праблемы ў нас на Беларусі? У сельскай мясцовасці? У нас цяпер ствараюцца ўсялякія фірмы, якія, апрача хуткай нажывы, ні аб чым не дбаюць. А чаму б не наладзіць вытворчасць гэтых машын, арганізаваць службу па нарыхтоўцы такога паліва. Ачысцілі б нашы лясы ад галля, якое гніе, нашы дрэваапрацоўчыя заводы ад рэштак вытворчасці. Развозілі б гэтую драўляную сечку сваім заказчыкам. Вёску ўжо не палохала б адключэнне расійскага газу. Ды драўляная сечка — такі энерганосьбіт, які не вычэрпваецца: лясы ж растуць.

Я расказаў, што бачыў, аб вузкай спецыялізацыі па вытворчасці свініны і малака. Пазнаёміў мяне Юрген яшчэ з адной галінай гаспадарання — садоўніцтвам. Паказаў свой сад і павёз у такі мікраён, дзе навакольныя сяляне займаюцца вырошчваннем яблыкаў. І толькі. Ніхто тут не трымае ні свіней, ні курэй, не гаворачы ўжо пра карову. Усе навакольныя палі засаджаны яблынямі. Мы можам падумаць: гультайская работа — пасадзіў яблыню і чакай, пакуль яблыкі паспеюць. О, не! Працы тут, у садзе, не меней, чым у любой галіне паляводства.

Саджанцы сяляне атрымліваюць з гадавальніка — трывалыя, якасныя, вышэйшых гатункаў. Яблынькі невялікія, таму прымацоўваюцца да кала. Галінкі, каб не ламаліся ад грузу пладоў, прывязваюцца да кала шпагатам. Яблыню ад яблыні садзяць зусім блізка, але міжрадкоўі шырокія, каб мог свабодна хадзіць трактар з рознымі прыстасаваннямі: для абрэзкі сучча, забівання калоў, рыхлення прыствольных кругоў, унясення ўгнаенняў, транспарціроўкі пладоў і інш.

Селянін, да якога прыехалі, мае 10 га зямлі. Узяў у банку крэдыт, адбудаваў сховішча для яблыкаў на сотні тон, захоўвае свае і прымае ад суседзяў. Камеры сховішча герметычна зачыняюцца, падтрымліваюць патрэбную тэмпературу, вільготнасць. Усё рэгулюе камп'ютэрная сістэма. Здаровыя, свежыя яблыкі ідуць на продаж, з рэштак цісне сок, робіць таксама гарэлку. Яму дазваляюць на год зрабіць трыста літраў.

Мае 5 трактароў з рознымі прычэпамі да іх, дзве легкавыя машыны, малалітражны аўтобус, цудоўны новы дом, пабудаваны ў стылі сучаснай архітэктуры.

Працуюць тут бацька, маці, сын і яшчэ адзін наёмны рабочы.

І ўсё ж я не выцерпеў, яшчэ раз спытаў, бо цікавіла, як разважае гэты селянін: "Чаму не трымаеце ні каровы, ні свіней, ні курэй?" Атрымаў усё той жа адказ: "Гэта сваё ўжо аджыло. На невялікім кавалку зямлі займацца ўсім і нічым дасканала — нерэнтабельна. Бачыш, колькі ў нас толькі для саду тэхнікі і абсталявання? А каб яшчэ кароў трымаў, свіней? Не, гэта немагчыма. Спецыялізацыя па галінах вытворчасці, толькі спецыялізацыя!"

Цудоўны хутар, прыгожая забудова, электроніка, надзейныя машыны, працавітыя людзі! Усё гэта ніяк не параўноўваецца з нашай адсталасцю.

Гаспадар з гонарам паказваў мне свой спецыялізаваны цэнтр. Падараваў літровую бутэльку чыстай, як сляза, гарэлкі, выробленай з яблыкаў. На наклейцы яго прозвішча.

Калі ехалі дахаты, мне Юрген сказаў: "Нялёгка яму, па вушы ў даўгах, набраў у банку крэдытаў, цяжка расплаціцца".

Пацікавіўся, як вырашаюць немцы праблему маладой сям'і.

Пасля снедання гаспадыня мяне павезла ў сельскую мясцовасць да сваёй дачкі. Дачка выйшла замуж за хлопца, сталяра па прафесіі, які пачынаў сваё багацце з нуля. Бацькоўскі дом дазваляў прыняць маладую сям'ю ў адно гняздо, але дзеці гэтага не захацелі. Яны самастойна пачалі прабіваць дарогу.

Купілі хутар з трыма гектарамі зямлі. Поле засеялі травой, заняліся гадаваннем бычкоў і цялушак на мяса. Усю сваю сядзібу абгарадзілі сеткай, зверху калючым дротам, скаціну выпусцілі на свабодны выпас. Калі непагода, сама заходзіць у хлеў.

Бацькі крыху дапамаглі пабудаваць новую хату. Па нашых мерках — гэта цудоўны палац, аздоблены сучаснымі будматэрыяламі, ну і што зусім зразумела, зроблены з нямецкай акуратнасцю. Стары дом малады гаспадар заняў пад майстэрню, дзе рэстаўрыруе старую мэблю. Тлумачылі, што ў Нямеччыне пракацілася хваля настальгіі па мэблі сваіх дзядоў і прадзедаў. Работы хапае. Наймае яшчэ аднаго работніка — дзяўчыну, якая скончыла спецыяльнае вучылішча па гэтай справе.

Маладая сям'я мае свой трактар з прычэпам, аўтобус для перавозкі мэблі, ну і, як усе тут, свой "Мерседэс".

Калі прыехалі, якраз зарэзалі бычка і мяса разважвалі па порцыях, фасавалі ў мяшочкі.

Пачастунку ніякага не наладзілі, тут не заведзена, як у нас.

Па дарозе дадому я спытаў Лорэ, ці шчаслівая іх дачка. Адказала: "Вельмі шчаслівая. Яна любіць прыроду і ні на які гарадскі камфорт яе не заменіць". Але дадала, што з працаўладкаваннем моладзі ёсць немалыя цяжкасці, эмігрыруюць у Канаду, Аўстралію.

На трэці дзень майго знаходжання ў Равенсбургу "Швабішэ цайтунг" надрукавала артыкул "Успаміны остарбайтэра: магчымасці дружбы і партнёрства" і фота, дзе мы з Юргенам вядзём размову. Фота і артыкул зрабілі мяне вядомым у горадзе, мяне з Юргенам пазнавалі на вуліцы, пасыпаліся запрашэнні ў госці. Займеў магчымасць выбіраць, куды паехаць. Сказаў Юргену, што цікаўлюся дробнымі прадпрыемствамі.

І вось едзем на заводзік, калі яго можна так назваць, па апрацоўцы драўніны. Прыватнае невялічкае прадпрыемства: 4 рабочыя (афрыканцы) і гаспадар. Што робяць? Скупляюць лясныя адходы: тоненькія дрэўцы, тоўстыя сукі дрэў. Тонкія дрэўцы абточваюць на такарным станку на цыліндры, разрэзаюць на патрэбную даўжыню, пратручваюць у спецыяльнай камеры антысептыкам. Нарыхтоўкі выкарыстоўваюць на слупкі для агароджы, на калы пад яблыні. З сукоў робяць калочкі пад памідоры і другія агародныя патрэбы. Калі дзе пападзецца таўсцейшае палена, то рэжуць на дошкі, майструюць сталы, лаўкі, у стылі натуральнага дрэва. Стружкі і апілкі пакуюць у кантэйнеры, адпраўляюць на другое прадпрыемства.

Уразіла чысціня і парадак. Усе нарыхтоўкі павязаны па гатунку і памерах у пучкі, прывязаны да іх этыкеткі, дзе паказаны размеры матэрыялу. Цана дагаворная. Нідзе няма не толькі смецця, але нават і пылу.

Гаспадар, сярэдніх гадоў мужчына, з павагай аднёсся да мяне, з гонарам за сваю справу расказваў пра тэхналогію сваіх такіх простых, але патрэбных чалавеку рэчаў. На развітанне падараваў сталярны складны метр і аловак да яго.

Пішу пра гэта прыватнае прадпрыемства, каб падказаць нашым маладым прадпрымальнікам, на чым можна зарабляць грошы.

— Хочаш паглядзець майстэрню ўласніка, які рамантуе легкавыя машыны? — пытае Юрген.

— З вялікай цікавасцю, — кажу.

— Дык паедзем, мне трэба памяняць пакрышкі.

Працуюць тут тры мужчыны, адна жанчына. Пабудаваў яе гаспадар 30 гадоў таму назад. Браў у банку крэдыт. Памяшканне прасторнае, светлае, утульнае, чыстае. Вакол сцен розныя станкі, прыстасаванні. Адна машына ўжо падвешана на вышыню чалавечага росту, ля яе ўвіхаецца майстар, кліент чакае. Юрген заяўляе пра сваю патрэбу. Гляджу: аўтаматычна падымаецца сцяна і майстар заганяе машыну.

Зручнымі дамкратамі прыпадняў яе, падключыў пнеўматычны ключ. Балты толькі жых-жых — і паадкручваў. Палажыў колы на спецыяльнае прыстасаванне, праверыў, ці ёсць вібрацыя, пакрышкі зняў вокамгненна таксама з дапамогай таго ж пнеўматычнага ключа. Затым адкрыў капот, уважліва агледзеў рухавік, штосьці падправіў, замацаваў і толькі тады буркнуў: "Гатова".

Пакуль Юрген плаціў маркі, майстар выгнаў машыну на двор.

Заўважыў я, што ў майстэрні ідэальная чысціня, нічога не валяецца пад нагамі, для адходаў стаяць кантэйнеры. Калі незнарок майстар капнуў на падлогу масла, тут жа выцер анучкай. Анучка для яго такая ж прылада працы, як і ключы ці манціроўка.

Калі ўжо садзіліся ў сваю машыну, пад'язджае чорны шыкоўны "Мерседэс". "Цыган", — паказвае Юрген. Я знарок задаў правакацыйнае пытанне: "Чаму вы церпіце цыганоў?" — "Пачнём выганяць цыган, дабяромся да яўрэяў, а затым і да палякаў. Мы ўжо гэта праходзілі. Цяпер мы — дэмакратычная краіна, звароту да старога ў нас болей не будзе", — запэўніў мяне немец.

Праязджаючы прыгарады Равенсбурга і Вайнгартэна, Ліндаў і Мюнхена, праязджаючы па вясковых вуліцах, аглядаючы навакольныя хутары, я заўсёды захапляўся прыгажосцю ўласных домікаў гараджан і сялян. Як хацелася зайсці туды, паглядзець, што за людзі тут жывуць, пацікавіцца іх багаццем, распытаць, на якія сродкі яны пабудавалі такое жыллё.

І вось такая магчымасць у мяне з'явілася. Запрашаюць у госці настаўнікі. Зразумела, спрацаваў газетны артыкул.

Ён выкладае ў школе, як у нас кажуць, тэхнічную працу, яна — таксама вучыць школьнікаў шыць, варыць, займацца дамашняй гаспадаркай.

Дом стаіць на касагоры. Расказваў гаспадар, што гэта месца ніхто не хацеў займаць, лічылі яго нязручным, а ён узяў, бо яно каштавала танней. Будавацца пачаў у 1970 годзе.

Асабняк на тры паверхі ў стылі сучаснага мадэрна. Пакояў 9. Гэта: кухня, сталовая, гасціная, спальня, асобныя пакоі для дзяцей, калі прыязджаюць. У іх сын і дачка. Там ванны, туалеты, склады, майстэрня для гаспадара.

Дом цагляны, звонку светлая тынкоўка. Страха, якая служыць сцяной і столлю трэцяга паверха, з нейкага моцнага тоўстага шыферу, які нічога агульнага не мае з нашым шыферам па якасці. Столі, карнізы і ўсякая абламоўка з амерыканскай хвоі, канадскага клёну. Вокны шырокія, без рам, на ўсю сцяну. Падлога высцелена лінолеумам, толькі не такім, як у нас, а з нейкай шэрай палатнянай паверхняй, мяккай і цёплай. Планіроўка — не ведаю: ці можна яшчэ зручней прыдумаць. Нават з кухні ў сталовую акно для падачы посуду прадугледжана. Усходкі на паверхі — зручныя, лёгкай формы, аздоблены пад натуральнае дрэва. Ну, а пра мэблю — то адным сказам не апішаш. Сучасная, зручная, практычная, прыгожая. У доме дзве ванны з душам, тры туалеты, кухня — не кухня, а фабрыка-кухня. Усё пад рукамі, зручна гатаваць страву. Кругом сцен сталы, на іх розныя механізмы для прыгатавання ежы.

Зацікавіўся, як дом абаграваецца.

Гаспадар павёў у падвал, паказаў кацёл і сістэму ацяплення. "Рускі газ нас грэе", — усміхнуўся. "Вось так, — думаю, — немцаў грэе, а беларусаў не хоча".

Пад домам гараж на дзве машыны. Агарод невялікі, хоць на гары.

Пытаю, дзе бралі сродкі, каб такі твор мастацтва збудаваць? Прызнаецца: "Збіралі са свайго заробку, крыху бацькі дапамаглі, а многа работ я выканаў сам. Усё ж на гэта я вучыўся і сам вучыў". А я падумаў: нямала і ў нас здольных майстроў, але дзе будматэрыялы такія купіш? Наша індустрыя працавала на мілітарызацыю для здзяйснення ідэі камунізму ва ўсім свеце. Пра добрыя дарогі, пра сучаснае жыллё, пра дабрабыт простага чалавека ніхто не думаў. Лічылася амаральным мець свой шыкоўны дом. Як за шчасце, людзі хапаліся прыдбаць які куток у камуналцы.

Тэлефонны званок. Юрген падымае трубку, слухае. Звяртаецца да мяне: "Запрашае ў госці граф. Паедзем?" Думаю: жывога графа яшчэ не бачыў, а толькі ў кіно. "Згодзен", — адказваю.

Чакаю, калі пад'едзем да графскага палаца. Ды не. Спыняецца машына ля звычайнага гарадскога шматкватэрнага дома. Падымаемся на трэці паверх. Заходзім: стандартная двухпакаёвая кватэра. На стале газета "Швабішэ цайтунг" з раскрытай старонкай, дзе наш фотаздымак і артыкул пра мяне, так што знаёміцца неабходнасці не было.

Графу 58 гадоў, жыве адзін, жонка памерла. Адзіны сын вучыцца недзе ў Цюрынгіі. Старому патрэбен дагляд, пакутуе на склероз. Суседзі па чарзе прыходзяць яму дапамагчы. Сёння дзяжурыць малады мужчына. Сустрэлі ветліва, як умеюць гэта рабіць выхаваныя людзі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Германія: праз 50 гадоў

Запіскі былога остарбайтэра

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Запрасілі за стол. Прыгатавана ўжо кава, бутэрброды, сыр, свежыя памідоры. Пасля кавы падалі піва, затым бутэльку лікёру.

Граф пакарыў мяне сваёй прастатой, зайздроснай эрудыцыяй (усе паліцы ля сцен застаўлены кнігамі), нават па-руску ўмее крыху гаварыць, ганарыцца, што сярод каштоўных рэчаў у яго — руская ікона Божай Маці.

Чалавек гэты падкупляе сваёй прастатой, дэмакратызмам, павагай да субяседніка.

Пасля візіту пытаю ў Юргена, чаму кватэра ў графа не графская. Заўважае: "Ад графа толькі званне прадкаў засталося, як і ва ўсіх цяперашніх баронаў і графаў. Багацця яны ўжо не маюць, каця жаданне госці на кожным банкеце". Не ўзяўся б я апісваць гэты эпізод, каб не прыйшла мне восць такая думка.

Мы пасля рэвалюцыі зруйнавалі з зямлёй дваранскія гнёзды, а немцы сёння ў такіх маёнтках абсталявалі спецыялізаваныя фермы. Мы сваіх графаў, хто не паспеў эмігрыраваць, ліквідавалі як клас. Тут яны без насілля, эвалюцыйным шляхам перарадзіліся ў чэхаўскіх вясельных генералаў.

Як важна ўмець прагназаваць гістарычны працэс.

Зразумела, не мог я не пабываць у школе. Сорак сем гадоў адпрацаваў настаўнікам. Я заўсёды абураўся уніфікаванасцю нашай школы: аднолькавыя праграмы для розных па здольнасці дзяцей, аднолькавыя тыпы школ у вёсцы і горадзе, аднолькавыя падручнікі і г.д. Бышцам не існуе праблемы падыходу да кожнай асобы індывідуальна. Карцела давядацца: няўжо і немцы па аднаму трафарэту штампуюць? Аказваецца — не. Пасля чатырох класаў вучань пачынае шукаць сваё месца ў школе. Ёсць розныя тыпы школ, ёсць у самой школе выбар напрамку — на каго вучыцца.

Я быў на ўроку чытання ў шостым класе, які давала дзяўчына-старшакласніца. Яна ў гэтай школе рыхтуе сябе да прафесіі настаўніцы. Я заўважыў, што выбар дзяўчына зрабіла правільны.

У школе атмасфера дэмакратызму, свабоды, гэта не азначае, што тут на галовах ходзяць. Дзверы кабінета дырэктара школы заўсёды адчынены, любы вучань у любы час можа да яго зайсці.

На сценах вывешваюцца толькі малюнкі вучняў, у шкляных вітрынах — рэчы, зробленыя вучнямі ў школьных майстэрнях.

Парты-сталы на розных уроках перастаўляюцца рознымі камбінацыямі, так сканструяваны, каб лёгка было іх перасоўваць.

Будынак школьны ўтульны, прасторны, мноства падсобных памяшканняў, кабінетаў, лабараторый.

У кабінеце тэхнічнай працы па сталярнай справе старшакласнікі займаліся кожны сваёй справай без настаўніка. Уразіла багацце абсталявання, наяўнасць усялякіх прыстасаванняў. Хто майстраваў шкатулку, хто выпільваў лобзікам палічку, а хто ўжо гатовы выраб даводзіў да ладу. Я пачаў гаварыць з дзецьмі па-нямецку, а яны мне: "Гаварыце па-руску, мы лепей зразумеем". Настаўніца, якая мяне суправаджала, паясняе: "Гэта дзеці немцаў з Паволжа, якія сюды перасяліліся".

Усе вучні харчуюцца ў школьнай сталовай. Стравы танныя, бо даплачвае дзяржава. Заняткі ў адну змену. Але пасля трох урокаў доўгі перапынак, і дахаты дзеці прыходзяць позна.

Ля пад'езда школы стаіць з паўсотні легкавых машын.

Вечарам наведаў курсы для дарослых па вывучэнню рускай мовы.

Сяджу на ўроку. Дзесяць вучняў, з іх шэсць пенсіянеры, астатнія — моладзь. Вынаходлівая настаўніца падключыла мяне дапамагаць ёй. Атрымалася цікавей. У канцы заняткаў я спытаў курсантаў, чаму яны захацелі вывучаць рускую мову. Адказ быў адзін: мы маем многа рускіх сяброў і хочам размаўляць з імі на іх мове.

Я яшчэ раз упэўніўся: усё ж многа змянілася за 50 гадоў. Не тая ўжо Нямеччына, не тыя немцы.

Заходзіць у мой пакой Юрген.

— Спусціся ўніз у касцюме пад гальштукам.

Што там яшчэ? — спрабую здагадацца.

Сустракае гаспадыня:

— У нас вялікае свята. Будзем снедаць у банкетнай зале.

На стале святочны пірог, гарыць свечка, букет кветак, пасуда дарагая.

— Памолімся! — загадаў гаспадар.

Маліліся кожны сам сабе. Калі скончылі "Отча наш", я перахрысціўся. Бачу — яны не хрысцяцца. Пытаю — чаму? Юрген адукоўвае мяне: "Лютэране хрысцяць сябе толькі ў думках, без жэсту рукі".

Калі ўсталі з-за стала, спыталі, якога я веравызнання.

— Праваслаўнага, — адказаў.

— Па-нашаму — артадокс, — удакладнілі. — А якую царкву хочаш наведаць — каталіцкую ці лютэранскую?

— Лютэранскую, вядома.

Калі між праваслаўнымі і каталіцкімі храмамі ў прынцыпе няшмат істотнай розніцы, то лютэранская кірха адрозніваецца тым, што не мае ні купалаў з крыжамі, ні званіцы. Архітэктура храма здзіўляе сваёй прастатой. Нахілены адна на адну сцены, ды так, каб не было ніякай сіметрыі. Новы храм, пабудаваны ў навейшым стылі.

У каталіцкіх, праваслаўных храмах богаслужэнне прыцягвае сваім эмацыянальным уздзеяннем: велічная арганная музыка, высокамастацкі прафесійны хор, адзенне святароў, маляўнічыя роспісы сцен, столі, іконы святых, сам рытуал богаслужэння. Абыякавай, безудзельнай — самая чэрствая душа не застанецца.

А тут — чыстыя белыя сцены, чыстая белая столь, з якой звісае свяцільнік. На пярэдняй сцяне ў правым і левым кутках табло, на якіх паказаны нумары псалмоў, якія сёння будуць спяваць. Малельная зала абсталявана лаўкамі.

У дзвярах кожнага, хто заходзіць, ветліва сустракае і вітае пастар.

— Госць з Беларусі, — знаёміць Юрген.

Пастар узнімае вочы, гаворыць, што чытаў у газеце артыкул, яшчэ раз паціскае мне руку.

Атрымалі чырвоныя кніжачкі з псалмамі і нотамі да іх, селі на лаўку.

Богаслужэнне пачалося з арганнай музыкі. Усе маўкліва слухалі. Я ніяк не мог зразумець рэлігійнай сутнасці твора: звычайная свецкая музыка.

Без асаблівага энтузіязму спявалі псалмы. Пропаведзь пастара прадаўжалася гадзіну. Асноўная думка казані — маральнае ўдасканаленне асобы праз веру ў Хрыста.

Увечары ў банкетнай зале сям'і Клет-Блецынгераў сабраліся іх сябры, радня і знаёмыя па лютэранскай абшчыне.

Спачатку пачаставаліся салодкімі стравамі, затым пачаўся афіцыйны рытуал.

Запрасілі музыканта, які на піяніна выконваў творы класічнай музыкі. Пад яго акампанемент спявалі псалмы.

Затым чыталі, каму было даручана, евангельскія прытчы і, што мяне здзівіла, урыўкі з твораў мастацкай літаратуры, дзе апяваліся высакародныя ўчынкі герояў, якія памагалі гаротным і прыгнечаным.

Атмасфера вечара лёгкая, ніякага малення, рэлігійнага фанатызму. Я заўважыў: мараль, ідэя ўсіх псалмоў, якія спявалі, усіх прытчаў, якія чыталі, былі накіраваны на выхаванне ў чалавеку высакародных пачуццяў: любоў да бліжняга, спачуванне і дапамога чалавеку, які трапіў у бяду, уменне ўзяць чужы боль на сябе і інш.

Свята рэлігійнае, але ніякай тут знешняй рэлігійнасці. Лютэранская вера зрабіла рэлігійнасць унутраным светам чалавека.

Я, магчыма, аб лютэранстве гэтым і не ўспомніў бы, каб не сутыкнуўся тут, у Нямеччыне, з праблемай, аб якой нельга змаўчаць, бо яна павучальная.

А праблема вось якая.

З Брэста кожны тыдзень ходзіць мікрааўтобус у Швейцарыю, вязе туды шафёраў, якія адтуль пераганяюць скупленыя старыя легкавікі. Па дамоўленасці і за плату агенцтва бярэ спадарожных пасажыраў. Уладкаваўся на гэты транспарт і я, бо мне якраз па дарозе.

Туды давезлі добра, пад'ехалі аж на самы падворак Юргена. Дамовіліся, што на наступным тыдні забяруць мяне назад. Прасіў хлопцаў, каб не падвялі. Запэўнілі: "Гасці, дзед, спакойна. Дамовіліся! Жалезна!"

Адчуваю: чытач ужо здагадваецца. Так, падманілі, не заехалі, хаця гэта кругу трыста метраў. Гадалі мы: можа, што здарылася? Ды не! Юрген пазваніў у Цюрых, там прадстаўнік агенцтва сказаў, што пяць закупленых машын пагналі ў Брэст, за імі пусты "рафік".

Зразумела, мне было крыўдна, што страціў такі выгадны маршрут, але яшчэ больш крыўдна і сорамна перад немцамі за нізкую культуру паводзін нашых людзей, за іх нядобрасумленнасць, хамства.

Вестка аб маёй непрыемнасці хутка разляцелася па ўсёй лютэранскай абшчыне. Кінуліся шукаць выйсця, перазваньваць па ўсіх знаёмых і незнаёмых, шукаць дзелавых людзей, якія маюць кантакты з Брэстам. Пошукі далі плён. Знайшлі. Знайшлі аж у Мюнхене. Малады бізнесмен перадаў: прыме мяне, як госця, і завязе бясплатна, але трэба тыдзень пачакаць.

Мае новыя знаёмыя тут жа прадумалі, чым мяне заняць на гэты тыдзень, куды звазіць, што паказаць.

Юрген са сваёй фраў Лорэ паляцелі самалётам на Канарскія астравы. Пагрэцца, як ён сказаў. Я застаўся адзін на ўвесь палац. У пакоях ніякіх замкоў. Усё адчынена. Вераць мне. Чакаю вечара. Прыедуць другія людзі, мяне забяруць. Сумна. Трывожна на душы. А што, калі і немцы падвядуць?

Выйшаў прагуляцца. Бачу здалёк — хтосьці абстрыгае зялёную агароджу вакол сада. Ёкнула на сэрцы: гэта ж мая былая работа ў баўэра ў гады майго юнацтва. Стрыг бы я і дагэтуль, каб перамог фашызм. Эсэсаўцы нас папярэджвалі, што пасля вайны дадому мы не паедзем, застанёмся тут назаўсёды рабамі.

Падышоў бліжэй — Антон, рабочы Юргена, немец, які перасяліўся з Румыніі. Чамусьці шкада стала Антона.

Хадзіў-блудзіў па палях. Як наяву паўставалі ў вачах сцэны грубай знявагі і выкрыкаў: "Лёўс! Лёўс!", малюнкі ўвішнай, хоць і паднявольнай працы, успомніліся сябры-остарбайтэры, французы, палякі, з якімі дзяліў лёс, чакаў вызвалення, радаваўся, калі амерыканцы бамбілі нямецкія гарады.

Нецярпліва паглядаю на гадзіннік. Бачу: паўзе "Мерседэс" пад гару дакладна ў тэрмін, як дамовіліся. Адлягло ад душы. Гэтыя не падводзяць.

Папаў у другую сям'ю, у новае асяроддзе. Тут людзі больш простыя, без элітарнай манернасці, дваранскага этыкету. Хаця ўсё культурна.

Гаспадар Жан-П'ер Маншон, француз, ужо 25 гадоў у Нямеччыне, адразу прынёс бутэльку каньяку, бутэрброды. Запрасіў на пачастунак. Выпілі па маленькаму кілішку, запрашае схадзіць з ім у тэатр. Я адмовіўся: адчуваў сябе стомленым. Дзесяць разоў перапрошваў, што вымушаны мяне пакінуць. Сам бачу — аж млее, каб схадзіць. Параўноўваю: у нас бы ад бутэлькі каньяку трактарам не адцягнуў, пакуль дна не ўбачыў. Гэты рабочы рвецца ў тэатр.

Наведаў гарадскую бібліятэку, якая размяшчаецца ў старой ратушы. Само памяшканне цікавае, пахне гісторыяй сярэдневякоўя. Муляжы ўваскрашаюць гэты час. Сабрана літаратура народаў усяго свету, але з рускіх кніг знайшоў толькі чатыры: Гогаль, Пастарнак, Горкі, Набокаў. Знайшоў і Літоўскі Статут 1588 года. Паказваю, экскурсаводка заўважае: "Гэта не беларускі, а літоўскі". Стаіць яшчэ на паліцы "Этнаграфія Беларусі". Тут ужо мусіў крыху расказаць пра гісторыю сваёй Радзімы.

Прайшліся па цэнтры горада. Вузкія вуліцы і вулачкі. Брусчатка. Старажытныя дамы ўсе адрэстаўрыраваны, умеюць гараджане шанаваць сваю гісторыю.

Падышоў паслухаць вулічных музыкантаў з Перу. У нацыянальных касцюмах, на нацыянальных інструментах выконваюць нацыянальныя песні і музыку. Выкананне народнае, хоць індзейскае, але нейкае блізкае і зразумелае. Душа забалела, што такія таленавітыя артысты жабруюць, чакаюць, калі хто кіне ў скарбонку некалькі пфенігаў.

Але ў Мюнхене стаў сведкам яшчэ большага нацыянальнага сораму.

Фраў Фрыдэрун Маншон пазычыла ў суседа японскую "Хонду", бо свая ў рамонце. Едзем на Мюнхен. Жанчына ў дарозе зрабіла добры круг, каб паказаць мне Альпы, мясцовыя краявіды, горныя пейзажы, зрабіць экскурсію ў замак Нойшванштайн, цудоўны помнік нямецкай архітэктуры і жывапісу.

У горад прыехалі позна вечарам. Начавалі ў цёткі Фрыдэрун. Цётка — пенсіянерка, жыве адна. Аглядаю яе аднапакаёвую кватэру. Стандарты гарадскіх кватэр прыблізна аднолькавыя як у немцаў, так і ў нас. Але гэта толькі прыблізна. Якасць апрацоўчых работ, выгод усялякіх — далёка мы стаялі. Вось напрыклад. На ўсю шырыню кватэры балкон, сцяна перад ім шкляная, без рам. Зранку, калі ўсталі, старая шторы адхіліла — не ведаеш, ці ў хаце ты, ці на двары. Цудоўны пейзаж. Ілюзія прастору. Для спальні перагародка. Кухня з усімі выгодамі. Мэбля як у старога чалавека — даўнейшая. Спытаў: колькі плаціць жанчына за кватэру. Кажа: "Дорага, вельмі дорага. 700 марак". Цікаўлюся: "А пенсія якая ў вас?" — "2000 марак". — "А колькі вам трэба на харчаванне?" — "300 марак". Вось табе і дорага. 1000 марак штомесяц кладзе на кніжку і не задаволена. Мусіць, гэта асаблівасць чалавечай натуры: колькі ні давай — мала. І ўсюды. Я пажартаваў: "Дык вы ж багаты чалавек". — "Не, — кажа, — я не багатая, багаты ўладальнік гэтага дома, якому мы плацім грошы".

Вось вам і тут праблема сацыяльнай няроўнасці, зайздрасці чалавечай.

Знаёмлюся з горадам.

Гістарычны цэнтр. Даўнінай павявае. На цесных брукаваных вуліцах народу — як мышы праслізнуць. З усяго свету. Больш чужая гамонка чуваць, чым нямецкая. Старадаўнія забудовы ствараюць настрой нейкай утульнасці.

Зайшлі ў піўны бар, дзе некалі Гітлер са сваімі аднадумцамі рыхтаваў грандыёзныя планы. Месца не знайшлося. Мужчыны п'юць пеністае піва з высокіх бакалаў, кураць. Гоман як на кірмашы, дыхае дэмакратызмам і рамантыкай. Каб дзе крышку папіць і што з'есці, зайшлі ў японскі рэстаранчык. Падалі нам па кубачку чаю і па кубачку падобнага на памыі булёну з лісцікам невядомай травы. За чатырох чалавек заплацілі 26 марак. Во як! Японцы ўмеюць на вадзе добра зарабляць, а мы дабро не ведаем, як прадаць. Садавіна на вёсках гніе, а гараджанін рад яблычку.

Прабіраемся ў натоўпе, чуем музыку. Прыбліжаюся: знаёмая мелодыя. На баяне і домры мужчына і жанчына рэжуць "Каробачку" пад аркай старой ратушы. Ды так жа віртуозна — за душу бярэ. Натоўп часам апладзіруе, скідаюць пфенігі ў футляр ад домры. Я ледзь не заплакаў: мелодыя Радзімы прадаецца тут, на вуліцы, пад сцяной, на бруку за пфенігі, як жабракам ці калекам. Немцы заўважылі маё хваляванне, не зразумелі, у чым справа, кінулі таксама манеты.

Не выцерпеў, спытаў у музыкантаў, што прымусіла іх так прыніжацца.

— Нам грошы трэба! — вінавата буркнуў мужчына.

Адказаў па-беларуску.

У Равенсбургу — амерыканскія індзейцы.

У Мюнхене — беларусы.

Зайшлі ва універмаг харчовых тавараў купіць на дарогу прадуктаў. Я вачам сваім не паверыў, хоць да гэтага быў падрыхтаваны. Каб паверыць — трэба бачыць сваімі вачамі. Трохпавярховы гігант на сваіх доўгіх, як вясковая вуліца, радах, дзе раскладзены на паліцах, вітрынах, халадзільных шкляных камерах расфасаваныя, цудоўна ўпакаваныя тавары, змяшчае тут столькі прадуктаў, што пэўна хапіла б накарміць не толькі Мюнхен, але і ўсю Нямеччыну. Сотні малочных і сотні мясных вырабаў, садавіна, агародніна, свая і заморскіх краін. Усё расфасавана ў каробачкі, пакуначкі з фольгі і паперы ў мяшочкі, у цюбікі і інш. Прадукт захоўваецца ў свежым выглядзе доўга, не псуецца.

Кожны зразумее: каб забяспечыць народ такім высакаякасным харчаваннем, трэба наладзіць індустрыю яго вырабу. Тут яна наладжана. А адкуль бярэцца мяса, малако, садавіна, агародніна — я ўжо крыху разважаў пасля сваіх папярэдніх назіранняў у вёсцы.

Фрыдэрун не паехала дахаты. Ужо трэці дзень чакае, каб мяне адправіць. Нямала я ў сваім жыцці сустракаў добрых людзей, але такую спагаду, можна сказаць, да мяне, чужога чалавека, адчуў упершыню. Накупляла падарункаў маім сынам, унукам. Пасылае ім прывітанне. Такі ж спагадлівы і яе муж Жан-П'ер. Гэта людзі, з якімі як пазнаёмішся, дык і пасябруеш, і здаецца, сябрамі былі ўжо даўно, цэлае жыццё.

Якімі парывамі душы, якімі прынцыпамі яны кіруюцца? Адкуль столькі сяброўскай цеплыні? Можна падумаць, што гэтыя людзі багатыя і выстаўляюць напаказ сваю дабрачыннасць? Дык не. Муж працуе адзін, яна, маці пяцярых дзяцей, падзарабляе, як у нас кажуць, надомнай працай: вяжа пуловеры, тчэ шарсцяныя пледы, пакрывалы. Па якасці і эстэтычнаму густу яе вырабы не ўступаюць фабрычным. Стаяць у хаце кросны, калаўротак, другія прылады ткацтва. Здавалася б, у такой індустрыяльнай краіне, як Нямеччына, ручная праца ўжо не ўпісваецца і не патрэбна. Ды не, яшчэ як патрэбна. Створана тут таварыства, якое апякуе такіх жанчын, забяспечвае воўнай, ніткамі.

Як да месца тут наша прымаўка: свет не без добрых людзей!

Канчаю запісы. Хто іх прачытае, можа папракнуць: "Падумаеш, убачыў у немцаў толькі добрае, хапае там і недахопаў".

Так, ёсць свае праблемы, нават балючыя. Жан-П'ер захварэў, трэба легчы ў бальніцу. Яму рахунак — 400 марак за суткі. Адмовіўся. Пайшлі ў аптэку купіць таблеткі ад крывянога ціску маёй жонцы. Юрген заплаціў за 100 таблетак 100 марак.

І ўсё ж нам ёсць тут чаму павучыцца. Нямеччына сёння — гэта наша заўтра. Я ўбачыў не тую краіну, што была 50 гадоў назад, а новую, дэмакратычную, гасцінную. Калі я ад'язджаў, мяне спыталі, з якімі думкамі развітваюся з імі. Я адказаў: "З пачуццём павагі да вашага народа. Калі ў 1945 годзе я вяртаўся дахаты, праехаў па вашай зямлі з захаду на ўсход, бачыў зруйнаваныя з зямлёй вашы гарады, фабрыкі, заводы. За 50 гадоў вы не толькі ўваскрэслі з попелу, нават сталі багатымі.

Але каб вы мне прапанавалі застацца ў вас, забяспечылі багатай кватэрай, падаравалі шыкоўны "Мерседэс", гарантавалі добрую пенсію, я б усяго толькі падзякаваў, бо так занудзіўся па сваёй Беларусі, што лічу ўжо не дні, а гадзіны і хвіліны, каб вярнуцца хутчэй. Праўда, Радзіма мая сёння ў вельмі цяжкім становішчы, але хворую маці сын шкадуе і любіць яшчэ больш".

"Мы цябе разумеем", — пачуў я ціхі голас.

Премьера рубрики

"Гордись, Беларусь!"

Беларусь в мире узнали не из-за наших политиков, спорящих по поводу и без повода. Славу республике создал спорт.

Помню, приехали в Шотландию на юношеский чемпионат Европы. Кроме наших, в отборочной группе были местные ребята и финны. Белорусов всерьез не принимали, а они возьми и выиграй первое место, причем обыграли шотландцев. Те с поля не уходили, плакали, стоя на коленях. А на прощальном ужине не отходили от наших ребят. Переводчикам пришлось потрудиться. Вопросов возникало множество. Дошло до того, что раздобыли карту и на ней отметили кружочек со словом Минск.

Теперь, когда на международной арене Беларусь выступает самостоятельной командой, интерес к ней возрастает. Благодаря спорту нам открывается Европа и заокеанье.

Под новой рубрикой "Народная воля" будет рассказывать о звездах разных поколений.

Ждем от читателей предложений, с кем они хотели бы встретиться на страницах газеты, о чем разузнать, кого вспомнить. У нас свои планы, задумки, но и ваши желания будут приняты во внимание.

Сегодня первая публикация. Ее подготовил воспитанник белорусской журналистики корреспондент московского журнала "Гала-спорт" в нашем регионе Сергей Щурко.

Александр МАЙСКИЙ.

Ждите Щербо в Сиднее

Вот так всегда. Позвонишь Щербо, чтобы проверить какую-нибудь информацию, а он возьмет и огорошит тебя скандальной новостью. Впрочем, эта из разряда приятных. Кому из нас не захочется увидеть его, знаменитого Щербо, выступающим за Беларусь на следующей Олимпиаде?

Поводом для звонка была информация, прилетевшая по телетайпу из-за рубежа: мол, Виталий Щербо вкупе с прославленным иллюзионистом Дэвидом Коперфилдом совершил месячное турне по Мексике. Разумеется, тур имел бешеный успех.

— Да, я тоже поначалу размечтался. Даже друзьям рассказал, с каким удивительным человеком буду вместе работать. Но все оказалось проще. Коперфилд — основатель фирмы "Мэджик промоушен, которая одним из своих подразделений, да и то отдаленно, соприкасалась с организацией турне. Так что все было, как обычно. Вместе со мной выступали такие известные люди, как Светочка Богинская, Лиля Подкопаева, Рустам Шарипов, Татьяна Лысенко и т.д.

В Америке умеют делать шоу. Свет, музыка, торжественное и не всегда формальное представление участников быстро настраивает зрителя на мажорный лад. А мы, естественно, стараемся ему подыграть: поведение, одежда и все такое прочее.

— Надеюсь, ты был прилично одет?

— Я там был большим человеком. С таким имиджем, сам понимаешь, как-то не с руки ходить колесом. Поэтому пришлось взять на себя бремя общения с публикой.

Я расхаживал с микрофоном в руке вдоль трибун и озабоченно потирал плечо. Попутно шучу, конечно. Когда же внимание публики полностью концентрируется на моем плече, перехожу к делу. С легкой грустью делюсь со зрителями своими воспоминаниями об Олимпиаде. Не всеми, конечно, а только теми, которые связаны с выступлениями на перекладине. Говорю, что, мол, имел лучшую комбинацию в мире и из-за не совсем здорового плеча не мог показать ее во всей красе. А перекладина... Она уже рядом, я вроде как случайно возле нее оказался. А публика уже волнуется, чувствует, к чему дело идет. А я все плачусь: ах, если бы мне смелости да побольше, показал бы я вам настоящую перекладину, но вот... боюсь. И как ты думаешь, что кричит мне после того застенчивая мексиканская публика?



— Мы верим в тебя, парень! Ты сделаешь эту дерьмовую перекладину. Давай-ка покажи класс всем этим з...м!"

— Да-да, почти слово в слово. Я, конечно, еще долго не решаюсь, но затем со свирепым видом бросаюсь на снаряд — и... Океан аплодисментов.

— А как насчет аплодисментов в обычной, негимнастической жизни?

— Все идет по плану. В январе лечу в Финикс, штат Аризона. Выкупаю там заранее присмотренный участок земли рядом с городом. В Америке обычно гимнастические клубы находятся не в центре, а где-то на отшибе.

— Это будет лично твой клуб?

— Нет, у нас паритет: 50 на 50 с одним американским тренером. Зовут его Ли Батаглиа, и известен он как наставник Курта Томаса. У него уже есть один клуб, в Чикаго, и дела там идут хорошо.

У нас уже набран штат. Секретарь — моя жена. Среди детских тренеров будут два соотечественника. Остальные — из команды Батаглиа.

— А кто из наших будет?

— Секрет. Но не мой первый тренер Выдрицкий, как ты подумал. Не хочет.

— На что будет делать упор твой клуб — на подготовку спортсменов высокого класса или же на работу с детьми?

— Может быть, это прозвучит негуманно, но деньги будем делать на детях. Как показывает практика, именно такой путь дает наибольший доход.

— Занятия с малышами будешь вести лично или как большой босс предпочтешь наблюдать за процессом со стороны?

— Боюсь, что времени непосредственно на работу в зале станет не хватать. Я и сейчас уже очень сильно занят, а что будет потом? Хотя в субботу, в воскресенье надо постараться. Да и для себя поработать тоже будет нелишне. Я же на Олимпиаде в Сиднее собрался выступать.

— М-да... Сказано в такой тональности, будто ты мне сообщаешь внутрисемейную новость о том, что дочка Кристина выучила английский алфавит.

— А что мне, по этому поводу пресс-конференцию закатывать? Я ведь не любитель всяких шумных историй и скандалов. Планирую выступить на вольных упражнениях и в прыжке. Во-первых, они всегда, в том числе и сейчас, были у меня на очень высоком уровне, который в мире очень редким людям под силу. Я вполне могу поддерживать эти два снаряда в боеготовности. И медаль могу выиграть, даже золотую. Кроме того, это будет очень круто — третья Олимпиада...

Незадолго перед Олимпиадой выступлю в нескольких турнирах посерьезнее, чтобы напомнить о своем существовании.

— По моим подсчетам, к тому времени ты должен подбираться к креслу президента Международной федерации гимнастики. Во всяком случае, быть где-то в техкоме...

— Я тут узнал недавно: чтобы попасть в ФИЖ, надо много миллионов на своем счету в банке иметь. Пробиться в техком проще, но путь туда тоже не медом намазан. Необходимо знание двух-трех языков, надо отсудить без нареканий очень много соревнований. Надо иметь много хороших знакомых. В принципе, формула та же, что и в федерации, — деньги и дружба больших людей. Я пока слишком молод, чтобы обладать в равной степени и тем, и другим. Следовательно, отодвигаю исполнение своей мечты лет эдак на пятнадцать. Сейчас мне надо к Олимпиаде готовиться. Ты напиши там, что я тренируюсь, а не в местном "Макдональде" объедаюсь.

— Прочесть эту фразу должны люди, которые в Министерстве спорта сняли тебя со ставки действующего спортсмена, да?

— Не буду с тобой спорить. Когда я был в Минске, то разговаривал об этом в министерстве. Мне пообещали, что все будет хорошо. И вот недавно я узнаю, что меня снимают со ставки. Это, конечно, логично: кто такой Щерба со своими десятью олимпийскими медалями для Беларуси? Так, мимо проходил. Обидно, как только человек заканчивает, ему тут же перекрывается кислород. А потом вы, журналисты, пишете о сломанных человеческих судьбах. Но ведь это мы уже проходили. Хотя какое там — проходили, все осталось по-прежнему. Последний пример — призовые за Олимпиаду и те налогом обложили. Когда я здесь об этом рассказал, все удивились. Но не очень, потому что у американцев и без того достаточно негативное впечатление о нашей стране. Популярностью она здесь не пользуется. А если и я начну говорить?

— Неужели еще не говорил?

— Нет. Я-то по характеру молчаливый и немного застенчивый парень.

— Какие еще новости?

— После трудов праведных решили семьей отдохнуть на Карибах, остров Гренд-Кэймон. Семь дней солнца и моря, 31-го декабря туда, 6-го обратно.

Дочка моя растет, ходит в садик. Помаленьку алфавит учит, уже пять букв освоила. Жена работает демонстратором-дизайнером в местном мебельном магазине, помогает клиентам проектировать дизайн квартиры применительно к той мебели, которую они приобрели. Иру в магазине уважают. Недавно были у них на предрождественской вечеринке. Подарки раздавали. Хорошие ребята. Одно плохо: придется Ире с ними в следующем году распрощаться — 1-го сентября мой зал в Финиксе уже должен принять первых клиентов.

Сергей ЩУРКО.

Нарком пакінуў аб сабе добрую памяць

З просьбай прысвоіць Луцкаўлянскай сярэдняй школе Гродзенскага раёна імя былога народнага камісара асветы БССР Антона Баліцкага звярнуліся ў высокія інстанцыі яе педагогі і вучні.

Антон Васільевіч, ураджэнец мясцовай вёскі Балічы, многае зрабіў для развіцця сістэмы адукацыі ў рэспубліцы. Да самай смерці - Баліцкага рэпрэсіравалі ў 1937 годзе - ён часта бываў у гэтых краях.

У музеі мясцовага калгаса імя Пятра Дзеншчыкова і ў школе захоўваюцца прысвечаныя наркому газетныя публікацыі і іншыя матэрыялы, а на доме, дзе ён нарадзіўся, некалькі гадоў таму ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Школьнікі і настаўнікі перапісваюцца з сынам свайго славутага земляка палкоўнікам у адстаўцы Антонам Баліцкім, які жыве ў Мінску.

БЕЛТА.

На дарозе можна зэканоміць

На Беларускай чыгунцы з'явілася яшчэ адна льгота. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе дарогі, са студзеня ўведзены новы від ільготных праязных білетаў на прыгарадныя паязды для вытворцаў, навучэнцаў і пенсіянераў, якім прыходзіцца кожны дзень ездзіць на вучобу ці работу. Для набыцця такіх білетаў неабходна прад'явіць у касу даведку з прадпрыемства або навучальнай установы і пашпарт для пацвярджэння месца жыхарства.

Таццяна СМІРНОВА, БЕЛТА.

ТЕЛЕПРОГРАММА

Среда, 15 января

Белорусское телевидение

12.00 Видимо-невидимо.
13.00 Новости.
15.00 Новости (с сурдопереводом).
15.10 Сущность. "Колядки".
15.35 Мультфильм.
16.10 Усадьба. Программа для дачников.
16.30 Острый угол. Правовой тележурнал по письмам зрителей.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 "Белвидеоцентр" представляет: "Когда выбираешь гимнастику, выбираешь судьбу". Док.фильм.
17.45 Экономикст.
18.00 Новости.
18.15 "Клан". Худ.фильм (Франция). 2-я серия.
19.15 Тема дня.
19.30 "Музыкальная обойма". Белорусский хит-парад.
19.35 "Познай себя". Психолого-консультативная программа. Тема: "Профессия и личность". Прямая линия.
20.05 "Премьера". Творческое об"единение "Телефильм" представляет: док.фильм "Город, нарисованный осенним светом".
20.25 "Кто это?" Телеигра.
20.30 Авто-парк.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 К.Качалина в худ. фильме "Дикая любовь".
23.50 Новости.

ОРТ

11.00 Новости (с сурдопереводом).
11.15 "В поисках капитана Гранта". 2-я серия.
12.20 Смехопанорама. Ведущий — Е.Петросян.
12.47 Мультфильмы: "Дед Мороз и лето", "Маша больше не лентяйка".
13.15 Брэйн ринг.
14.00 Новости (с сурдопереводом).
14.20 "Космические спасатели лейтенанта Марша". Мультсериал.
14.45 Кактус и К.
14.55 До-ми-соль.
15.10 Зов джунглей.
15.40 "Карин и ее собака". Молодежный сериал.
16.10 ...До шестнадцати и старше.
16.35 "Вокруг света". По страницам передачи "Клуб путешественников".
17.00 Новости.
17.15 "Новая жертва". Сериал.
18.05 Погода.
18.10 Час пик.
18.35 "Угадай мелодию". Телеигра.
19.00 Передача Владимира Познера"Человек в маске" на Первом канале.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 Комедия "Свадьба в Малиновке".
22.35 Евгений Лебедев в фильме-спектакле "История лошади".
0.55 Пресс-экспресс.
1.15 Программа передач.

Канал "Россия"

7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Вести.
7.15, 9.55, 0.05 Товары — почтой.
7.25 Ретро-шлягер.
7.55 Наталья Варлей в программе "Бочка меда".
8.25 "Клубничка". Телесериал.
9.00 "Санта-Барбара". Худ.фильм.
9.45 Мульфильм.
13.20 "Дочери Калеба. Эмили". Телесериал (Канада). 3-я и 4-я серии.
15.00 Телетеатр. Ф.Каринти. "Волшебное кресло".
15.25 Эксповестник.
15.30 Образ жизни.
16.15 Иванов, Петров, Сидоров и другие.
16.55 Там на неведомых дорожках.
17.40 "Клубничка". Телесериал.
18.10 Социально-экономическое обозрение.
18.40 Особо важные персоны.
19.35 Наталья Варлей в программе "Бочка меда".
20.10 "Санта-Барбара". Худ.фильм.
21.05 Погода на завтра.
21.10 Добрый вечер с Игорем Угольниковым.
22.30 "Евгений Лебедев". К 80-летию со дня рождения.
23.10 "Отечеству служим". Концертная программа.

Санкт-Петербург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Информ ТВ.
12.10 "История любви". Сериал.
12.55 Срок ответа — сегодня.
13.25 Советы садоводам.
13.35 "Кагуяхимэ". Телефильм-сказка (Япония).
14.10 "Убойный отдел". Сериал.
14.55 "Как казаки инопланетян встречали". Мультфильм.
15.15, 20.45 Телеслужба безопасности.
15.25 "Личное дело". Г.Орлов.
16.10 "Чародей". Молодежный сериал.
16.35 "Черный кот". Художественно-публицистическая программа.
17.05 Храм.
17.35 Показывает Ленинградская областная телекомпания.
18.40 Большой фестиваль.
19.15 Спорт.
19.25 "История любви". Сериал.
20.15 "Поживем-увидим". Многосерийный видеофильм (Россия). 5-я серия.
21.00 "Убойный отдел". Сериал.
22.05 Событие.
22.20 Спортивное обозрение.
22.30 "Дворцовые тайны". Премьера док.мини-сериала (США-Великобритания).

НТВ

9.15 Утреннее "Времечко".
9.30 Женские истории. "Доктор Куин. Женщина — врач" (США).
10.30, 17.30 Программа для детей "Улица Сезам".
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
12.00 Открытый мир.
13.20 Большое "Времечко".
15.35 Дистанция 60.
16.35 "Голубое дерево". Худ.фильм.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.35 Герой дня.
19.00 Мир кино. Худ.фильм "Фанаты" (Италия).
20.40 "Алло! Фима".
21.40, 23.20 Времечко.
22.00 Час сериала. "Полиция Нью-Йорка" (США).
23.00 Сегодня в полночь.
24.00 Кино не для всех. Худ. фильм "Играем "Зомби", или Жизнь после битв".

8 канал

18.00 Для детей "Летающий дом".
18.30 Худ. фильм "Единожды солгав".
20.15 Мульт-планета.
20.30 Худ. фильм "Тертый калач".
21.45 Полископ.
22.00 Худ. фильм "Смерть и девушка".

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (0172) 229-28-71.
Тэл.\факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя адказнасці не нясе. Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ЗАТ "Летувас рытас". Адрас: г. Вільнюс, пр-т Гедыміна, 12а. Фармат А-2. Тыраж: першы завод —61 000 экз. Заказ №